Viestki549-1.qxd 10/27/2011 7:44 PM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

*інфармацыйны бюлетэнь*

**Viestki j Paviedamlenni**

✉ ***P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572***
Сусьветнае сеціва: ***www.baza-belarus.org***

**№ 11 (549)**
**Лістапад 2011 г.**





## Шаноўнае спадарства!

У канцы кастрычніка сёлета пабачыў сьвет чарговы нумар літаратурнага альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа “**БЕЛАРУС**” за 2011 год. На суд чытачоў прадставілі свае творы ў самых розных літаратурных жанрах 19 аўтараў зь 10 краінаў сьвету.

Прэзэнтацыя выданьня адбудзецца падчас лістападаўскага сходу арганізацыі былога Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА (адносна зьмены назвы былой структуры БАЗА глядзіце інфармацыю на апошняй бачыне) **12-га лістапада 2011 г.** На імпрэзе можна будзе пазнаёміцца зь некаторымі з аўтараў альманаху і выдаўцамі. **Толькі на прэзэнтацыі можна будзе набыць альманах па зьніжанаму кошту $10 за асобнік**.

Калі Вы ня можаце патрапіць на прэзэнтацыю, то апошні нумар альманаху, як і ўсе папярэднія, пачынаючы ад 2007 г., можна замовіць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку ***www.e-krama.com*** і зрабіўшы аплату крэдытнаю карткаю ці праз рахунак ***Paypal***.

Замову можна таксама зрабіць даслаўшы адпаведную аплату на адрас:

***BIELARUS***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

Чэкі ці грашовыя пераводы выпісвайце на імя выдаўца **Marat Klakotski**.

З пытаньнямі зьвяртайцеся на эл. адрас ***zamova@e-krama.com*** ці пішыце на вышэйпададзены паштовы адрас.

Кошты альманаху за розныя гады ў залежнасьці ад краінаў дасылкі падаём ніжэй:

| ***Выданьне*** | ***ЗША*** | ***Канада*** | ***Іншыя краіны*** |
|---|---|---|---|
| **“БЕЛАРУС” 2011** | **$16** | **$17** | **$18** |
| **“БЕЛАРУС” 2010** | **$17** | **$18** | **$19** |
| **“БЕЛАРУС” 2009** | **$17** | **$18** | **$19** |
| **“БЕЛАРУС” 2008** | **$16** | **$17** | **$18** |
| **“БЕЛАРУС” 2007** | **$16** | **$17** | **$18** |

Падтрымайце выданьне Вашымі замовамі, каб “**БЕЛАРУС 2012**” таксама змог пабачыць сьвет.

---------------------------------------

Таксама паведамляем, што пачынаецца збор твораў для літаратурнга альманаху “**БЕЛАРУС**” за 2012 год, друк якога заплянаваны на жнівень-верасень наступнага году. Умовы застаюцца такімі-ж як у папярэднія гады: зьмясьціць свае творы ў выданьні могуць аўтары, хто піша па-беларуску ў самых розных літаратурных жанрах. Адзіная ўмова – аўтары сёньня павінны жыць па-за межамі Беларусі.

Творы найлепш дасылаць у рэдакцыю электроннаю поштаю на адрас: ***zamova@e-krama.com*** У выключных выпадках, калі аўтары ня маюць доступу да сусьветнага сеціва, творы можна дасылаць поштаю запісанымі на CD ці DVD альбо надрукаванымі на паперы на паштовы адрас рэдакцыі пададзены вышэй.

Тэксты пажадана пісаць тарашкевіцай. Творы напісаныя наркамаўкай, у альманаху будуць надрукаваныя тарашкевіцай.

Кожнаму, хто вырашыць даслаць творы для альманаху, пажадана таксама даслаць свой фатаздымак і кароткую аўтабіяграфію і, калі захочуць, дадатковую інфармацыю пра сябе, якую яны хацелі-б паведаміць сваім чытачам.

Апошні тэрмін для дасылкі твораў **31 траўня 2012 году**.

Пасьля выхаду альманаху ў сьвет кожны аўтар атрымае адзін асобнік бескаштоўна. Аўтары пры жаданьні змогуць замовіць дадатковую колькасьць асобнікаў па сабекошту, які будзе паведамлены ім пазьней.

Ганарараў аўтарам рэдакцыя, нажаль, выплочваць ня можа, бо ня ёсьць камэрцыйнаю ўстановаю, а існуе толькі дзякуючы падтрымцы ахвярадаўцаў і чытачоў.

Жадаем посьпехаў!

Viestki549-1.qxd 10/27/2011 7:20 PM Page 1 (1,1)



# Кастрычніцкі сход аддзелу

У Доме Маракоў 8 кастрычніка прайшоў чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка спыніўся на падзеях у Беларусі за апошні месяц. Сп. Ільля Куніцкі адноснa нядаўна вярнуўся зь Беларусі і падзяліўся сваімі ўражаньнямі пра штодзённае жыцьцё і настроі жыхароў Беларусі.

Затым з гутаркаю пра культуру і гісторыю сярэднявечнай Беларусі выступіў былы старшыня Галоўнай управы БАЗА Антон Шукелойць. Прысутныя зь цікавасьцю праслухалі гутарку вэтэрана беларускага нацыянальнага руху і падзякавалі яму гучнымі воплескамі.

Затым з лекцыяй пра гісторыю і гістарыяграфію Беларусі выступіў сябар управы аддзелу Зьміцер Левіт. Ён спыніўся на манэры выкладаньня гісторыі ў былой БССР, калі ў галовы ўсяляк закідалася ідэя адзінага "старажытнарускага" народу і Кіеўскай Русі, як ягонай аб'яднанай унітарнай дзяржавы. Сп. Левіт даў этымалягічны і гістарычны аналіз самога тэрміну "Русь", спыніўся на паходжаньні назваў Літва, Беларусь і на пачатках ВКЛ. Прамоўца ўзгадаў млавядомыя факты з гісторыі Беларусі і спыніўся на значаньні Статуту Вялікага Княства для фармаваньня дзяржаўнай і этнічнай самасьведамасьці продкаў сучасных беларусаў. Сп. Левіт таксама ўзгадаў рысу аселасьці й стаўленьне беларускіх гэбраяў да Расеі, што знайшло сваё адлюстраваньне ў вядомай у ЗША кнізе Мэры Антын "Абяцаная зямля".

З паведамленьнем аб жыцьці й творчасьці выбітнага паэты Анатоля Сыса, прысьвечаным ягоным 52-м угодкам (26 кастрычніка), выступіла сакратар аддзелу Валянціна Якімовіч. Яна коратка распавяла пра трагічны жыцьцёвы шлях паэты і прачытала шэраг ягоных вершаў, што былі эмацыйна сустрэтыя прысутнымі.

Затым у традыцыйным разьдзеле "Рознае" адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу, якія мелі нагоду коратка распавесьці пра сябе, свае зацікаўленьні.

***Віталь ЗАЙКА***

# Да сытуацыі ў БАЗА

Апошнім часам адбылося некалькі падзеяў, што вымушаюць Нью-Ёрскі аддзел БАЗА канчаткова аддзяліцца ад арганізацыі, зь якой большасьць сяброў аддзелу зьвязваюць гады актыўнай працы і ахвярнага ўдзелу ў разьвіцьці беларускай грамады ў ЗША. У выніку захадаў непрызнанай аддзелам Галоўнай управы БАЗА, мы мусім цяпер стварыць асобную арганізацыю з іншай назвай. Таксама ў выніку захадаў Галоўнай управы, аддзел страціў кантроль над банкаўскім рахункам, дзе захоўваліся грашовыя сродкамі, сабранымі аддзелам. Гэты рахунак быў некалі адкрыты ад агульнага імя Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, але традыцыйна функцыянаваў праз скарбніка Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, тады як Галоўная ўправа мела свой уласны адмысловы рахунак.

Пакідаючы за сабой права абскардзіць дзеяньні Галоўнай управы праз належныя юрыдычныя шляхі, кіраўніцтва аддзелу схіляецца да неабходнасьці перарэгістраваць нашую арганізацыю і працягваць дзейнасьць па кансалідацыі беларускіх сілаў і ўзаемадапамозе ў Нью-Ёрку і Злучаных Штатах.

**На наступным сходзе 12 лістапада сёлета плянуецца правесьці агульны ўстаноўчы сход для перарэгістрацыі нашай арганізацыі.**

***Управа***

## Уплаты ў арганізацыю

Складкі й ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| Д. Валанцэвіч | 50 |
| А. Варабей | 50 |
| І. Вінгэль | 50 |
| В. Горбат | 50 |
| С. Дзегялевіч | 50 |
| Т. Іршына | 50 |
| Ю. Кот | 50 |
| Н. Кудзіна | 50 |
| Г. Лазука | 50 |
| А. Лапацік | 50 |
| І. Лапацік | 50 |
| А. Лапацік-Рэзанаў | 50 |
| Ю. Лапіцкая | 50 |
| А. Лук'янаў | 50 |
| У. Магера | 50 |
| М. Марозаў | 50 |
| П. Марук | 50 |
| В. Міхайлава | 50 |
| Д. Папок | 50 |
| А. Саковіч | 50 |
| Ю. Самусёва | 50 |
| Я. Шкаброва | 50 |
| С. Шырокін | 50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

*Паважаны **В. Каласоўскі** паведаміце, калі ласка, рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*

# Наступны сход

арганізацыі былога Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу 12-га лістапада 2011 году** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.*

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

**Заклікаем усіх сяброў прыйсьці на сход, бо на парадку дня будуць стаяць пытаньні, датычныя будучыні нашай арганізацыі.**

Падчас сходу адбудзецца **прэзэнтацыя** альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа **"БЕЛАРУС"** за 2011 год. Не прапусьціце магчымасьць пазнаёміцца з аўтарамі й выдаўцамі, а таксама набыць штогадовік па зьніжанаму кошту.

Паколькі арганізацыя былога Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА пастановаю Галоўнай управы была адлучаная ад структуры БАЗА, і вымушаная зьмяніць сваю назву, а якой яна будзе пакуль невядома, то інфармацыйны бюлетэнь аддзелу ад лістападаўскага нумару 2011 г. будзе мець скарочаную назву **"Весткі й Паведамленьні"**.

## Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

| | |
|---|---|
| В. Балашчанка | 30 |
| А. Варабей | 30 |
| І. Вінгэль | 30 |
| В. Горбат | 30 |
| І. Іршына | 30 |
| Г. Лазука | 30 |
| І. Лапацік | 30 |
| А. Марозаў | 30 |
| П. Марук | 30 |
| В. Міхайлава | 30 |
| Д. Папок | 30 |
| А. Саковіч | 30 |
| Я. Шкаброва | 30 |
| С. Шырокін | 30 |

**Шчыры дзякуй!**